ПАДЗЕЯ

# СЛОВУ РАДЗІМЫ НАСУСТРАЧ

**У першыя выхадныя верасня краіна па традыцыі адзначыла Дзень беларускага пісьменства. Шматлікія мерапрыемствы юбілейнага XXX свята прымаў горад Гарадок, раённы цэнтр Віцебскай вобласці. На свяце роднага слова пабывала дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

Як і штогод, каб прыняць удзел у свяце, у сталіцу Дня беларускага пісьменства з'ехаліся госці з усіх абласцей Беларусі – пісьменнікі, журналісты, выдаўцы, аматары чытання рознага ўзросту, прадстаўнікі ўлады. Юбілейнае, трыццатае па ліку свята друкаванага слова арганізатары вырашылі прысвяціць рэгіянальнай літаратуры, гарадам-сталіцам мінулых Дзён беларускага пісьменства. Таму ў свята з'явіўся гістарычны кантэкст, а многія выступленні гасцей насілі аглядны, рэтраспектыўны характар (былі паказаны выданні, якія выйшлі не толькі за апошні год). У склад дэлегацыі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ўвайшлі: лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко за творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва, паэт Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён); паэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён); адразу два прадстаўнікі Астравеччыны – празаік, публіцыст, драматург Ніна Рыбік і паэт, публіцыст, краязнавец Аляксандр Марозаў. Святочны Гарадок таксама наведалі гродзенскія паэты Людміла Шаўчэнка, Анатоль Апанасевіч, Дзмітрый Радзівончык; літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць і




дзіцячая пісьменніца Таццяна Сучкова. Сёлета кампанію пісьменнікам склала каманда Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага (аддзел абанемента), якая напярэдадні прывезла на Дзень беларускага пісьменства выставу кніг Гродзеншчыны і пра Гродзеншчыну, зрабіўшы наша выступленне больш змястоўным. Творчы дэсант з Прынёмання пераадолеў шлях даўжынёй у 560 кіламетраў, дарога заняла па часе каля 9 гадзін. Але стомленасць гасцям дапамаглі пераадолець сардэчная цеплыня і добразычлівасць гаспадароў.

У папрыгажэлым райцэнтры спецыяльна да свята быў узведзены цэлы літаратурны квартал з мноствам каларытных фотазон.



**Ля помніка палясоўшчыку Тарасу, герою паэмы «Тарас на Парнасе» ўраджэнца Гарадоччыны Канстанціна Вераніцына**

Лейтматывам творчай прэзентацыі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ пад назвай «У родным краі, як у раі» стаў аповед пра выдадзены летась зборнік прысвячэнняў класікам «Песнярам Айчыны». Кожны з выступоўцаў пастараўся знайсці і агучыць адказ на два пытанні: «Што для мяне рэгіянальная літаратура?» і «Які ён – пісьменнік-рэгіянал?». …Часта ў насычанай праграме Дзён беларускага пісьменства вельмі мала часу адводзіцца на выступленні пісьменнікаў, даводзіцца скарачаць аб'ём выступленняў або склад дэлегацый. Сёлета выступленне гасцей з Прынёмання ў літаратурным павільёне доўжылася амаль 3 гадзіны. Кожнаму хапіла часу на самыя падрабязныя справаздачу або агляд сваёй творчасці.




**Дзмітрый Радзівончык**



**Аліна Сабуць**




**Мікалай Іваноўскі**



**Таццяна Сучкова прачытала прысвячэнне Гарадку**



**Таццяна Яцук**




**Людміла Шаўчэнка**






Ніна Рыбік – адзіны ў складзе дэлегацыі празаік

Аляксандр Марозаў




Анатоль Апанасевіч і яго зборнік афарызмаў «Красные фразы»



Да выступленняў гродзенцаў далучыўся наш калега па абласной пісьменніцкай арганізацыі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, паэт Валянцін Семяняка




**Пасля літаратурнага марафону для гарадоцкай публікі**

Выступленні ў павільёнах прайшлі і 3-га верасня, у другі дзень свята. Акрамя таго, у праграме традыцыйнага канцэрта Саюза пісьменнікаў Беларусі выступіў паэт з Ваўкавышчыны Мікалай Іваноўскі (*на фота*).



Кульмінацыяй святочных падзей стала цырымонія ўручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі падчас ўрачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства на галоўнай сцэне. Да нашай агульнай радасці лаўрэатам вышэйшай літаратурнай узнагароды Беларусі стала наша калега па пісьменніцкай арганізацыі, педагог, навуковец Аліна Сабуць. Мы яшчэ і яшчэ раз сардэчна віншуем Аліну Эдмундаўну, адчуваем вялікую радасць і гонар ад заваявання гэтай высокай узнагароды прадстаўніком Гродзенскай вобласці і нашага дружнага творчага калектыва.





Нагадаем, што раней лаўрэатамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі ад нашай вобласці сталі гродзенская дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая ў намінацыі «Найлепшы твор для дзяцей і юнацтва» (2015) і паэт з Смаргонскага раёна Мар'ян Дукса (2016). Свае сардэчныя віншаванні мы адрасуем усім сёлетнім лаўрэатам.




**Пераможцы Нацыянальнай літаратурнай прэміі-2023 (спіс)**

...З важкім багажом уражанняў і станоўчых эмоцый ад сустрэч з сябрамі і калегамі, з натхненнем ад чароўнай атмасферы свята нам было прыемна вяртацца да плённых працоўных будняў. Шчыра дзякуем усім, хто спрычыніўся да арганізацыі паездкі групы літаратараў Прынёмання на XXX Дзень беларускага пісьменства ў Гарадок. Шлях дадому, як і дарога на свята, для пісьменнікаў стаў рухам насустрач роднаму слову, мірнай, стваральнай працы. І няхай так будзе заўжды.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**
Фота **Назара ХАЛЬКО**

***

**Яшчэ па тэме:**

http://www.oo-spb.by/index.php?id=4963

https://zviazda.by/be/news/20230903/1693737239-garadok-prymae-hhh-dzen-belaruskaga-pismenstva-cikavinki-pershaga

https://www.sb.by/articles/fotofakt-vtoroy-den-belorusskoy-pismennosti-v-gorodke.html



З аўтарам песень на словы гродзенскіх паэтаў Віктарам Мяцельскім (Пінск)



З калегамі з іншых абласцей

Дзень беларускага пісьменства